Першапачатковая анфіладная планіроўка часткова зменена. *Т. І. Чарняўская.*

**ПОЛАЦКІЯ ЗАМКІ.** Існавалі ў 16 — пач. 18 ст. ў гіст. цэнтры Полацка 2 замкі — Верхні і Ніжні. Пабудаваны з дрэва і каменю.

В е р х н і  з а м а к пабудаваны на месцы стараж. Полацкага дзядзінца 10 ст. (пл. да 10 га) на правым беразе Зах. Дзвіны пры ўпадзенні ў яе р. Палата. У сярэдзіне 16 ст. меў роў, вал і абарончую сцяну з 204 гародняў (рублены таўшчынёю ў 5 бярвён) і 9 вежамі (рублены таўшчынёю ў 3 бервяны) з баявымі ярусамі з байніцамі і амбразурамі для гармат, былі завершаны высокімі шатровымі дахамі. Красная (Каралеўская) вежа мураваная, астатнія — драўляныя. Віцебская (вяла да вусця Палаты) і Безыменная (вяла да Вялікага пасада) вежы мелі ў ніжніх ярусах праезды, злучаныя з мастамі на *ізбіцах.* На тэр. замка знаходзіліся 130 двароў заможных гараджан, двор полацкага ваяводы (6 жылых дамоў), 2 манастыры, *Полацкі Сафійскі сабор, Полацкі княжацкі храм.* У Лівонскую вайну (1558—83) у 1563 замак спалены, пазней па загаду Івана Грознага адбудаваны, меў абарончыя сцены-гародні і 7 баявых вежаў. У 1579 замак узяло штурмам і разбурыла польскае войска караля Стэфана Баторыя. Замак зноў адноўлены, аднак пасля гэтага часта гарэў (найбольшыя пажары ў 1607 і 1642). У руска-польскую вайну (1654—67) у 1654 былі пабудаваны гародні, 5 васьмі- і шасцігранных вежаў, рубленых у 2 бервяны, з 2—3 баявымі ярусамі, вышынёй 10—23 м. Частка сцен мела канструкцыю астрога. Тэр. замкаў 1706 472,5×283,5 м.

Н і ж н і  з а м а к (Стралецкі) пабудаваны ў 1563 рус. войскам на месцы Вялікага пасада. Быў умацаваны ровам і валам, драўлянымі абарончымі сценамі і вежамі. Прымыкаў з У да Верхняга замка, з якім злучаўся мостам. Зруйнаваны ў



Полацкія замкі. Малюнак С. Пахалавіцкага «Аблога Полацка 29.8.1579».

1579, пазней адноўлены. К 1654 меў 8 вежаў. На яго тэрыторыі захаваўся вал Івана IV Грознага. Паміж 1563—79 у цэнтры П. з. сталі 2 драўляныя вежы тыпу данжонаў (4- і 8-гранная з 3 баявымі ярусамі з перакрыццямі на бэльках, накрытыя шатровымі дахамі). П. з. знішчаны ў час Паўночнай вайны (1700—21) у 1706 па загаду Пятра I пры падыходзе да Полацка шведскага войска. П. з. замаляваў С. Пахалавіцкі, апісаў гісторык 16 ст. Р. Гейдэнштэйн.

*Літ.:* Ш т ы х о в  Г. В. Древний Полоцк. IX—XIII вв.— Мн., 1973; я г о  ж. Работы Полоцко-Минского отряда.— У кн.: Археологические открытия 1980 года. М., 1981; Полоцкая ревизия 1552 года.— М., 1905; С а п у н о в  А. Витебская старина. Т. 4.— Витебск, 1885; Г е й д е н ш т е й н  Р. Записки о московской войне (1578—1582).— СПб., 1889; Б р э ж г о  Б. Замкі Віцебшчыны.— Вільня, 1933. *Ю. А. Якімовіч.*

**ПОЛАЦКІЯ КНЯЖАЦКІЯ ПАЛАТЫ.** Існавалі ў 12—16 ст. Пабудаваны ў паўн. ч. полац-



Полацкія замкі. З гравюры 16 ст.



Полацкія княжацкія палаты. План.

кага дзядзінца. Відаць, у 16 ст. ўваходзілі ў палацавы комплекс полацкага намесніка. Рэшткі выяўлены археолагамі ў 1976—77. Асн. будынак (4,7×4,2 м) амаль квадратны ў плане, складзены з плінфы ў тэхніцы муроўкі «са схаваным радам», з З да яго быў прыбудаваны меншы аб'ём (2,5×2,4 м). Падмурак [таўшчыня 60—75 см (у малым памяшканні 50 см), глыбіня 1,8 м] з камянёў на вапнавым растворы. У 14 ст. з Пн да палат прыбудаваны драўляны (з сасновых брусоў) квадратны ў плане (5,3×5,4 м) аб'ём, сцены якога ўнутры былі абмазаны глінай. У палатах знаходзіліся печы, у іх канструкцыі выкарыстаны гаршковыя і пазней каробчатыя кафлі. Захаваліся падмурак і частка цаглянай сцяны.

*Літ.:* Раппопорт П. А., Шолохова Е. В. Дворец в Полоцке.— Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях института археологии АН СССР, 1981, в. 164; Раппопорт П. А. Русская архитектура X—XIII вв.: Каталог памятников.— Л., 1982.— (Свод археологических источников; в. Е 1—47). *А. А. Трусаў.*

**«ПОЛЕ́ССКАЯ ЖИЗНЬ»,** грамадска-палітычная і літаратурная газета ліберальна-буржуазнага, памяркоўна-апазіцыйнага кірунку. Выдавалася на рус. мове ў Гомелі 3 разы на тыдзень з 17(30).10.1909 да 27.12.1911(9.1.1912), з 11(24).1 да 27.6(10.7).1910 не выходзіла.

«П. ж.» прадаўжала праграму газ. *«Полесская мысль».* Змяшчала інфармацыю пра дзейнасць урада і Дзярж. думы, хроніку мясц. жыцця, асвятляла побыт гарадскога «дна», надзвычайныя падзеі ў краі. Часам крытыкавала палітыку правых партый і цэнзурны ўціск. Публікавала юбілейныя артыкулы, прысвечаныя жыццю і творчасці М. Чарнышэўскага (21.10.1909), М. Успенскага (26.10.1909), П. Якубовіча (26.3.1911), мастака А. Куінджы (16.7.1910) і інш.; знаёміла чытачоў з паасобнымі творамі Л. Андрэева, Шолама-Алейхема і Мендэле-Мойхер-Сфорыма. У матэрыялах, прысвечаных Л. Талстому (5—19.11.1910), аўтары захапляліся талстоўскай маральна-філас. канцэпцыяй жыцця, бачылі ў ім найвялікшага мастака і мысліцеля, аднак абыходзілі яго рэалізм, сял. класавую пазіцыю і крытыку бурж. грамадства. Друкавала нарысы рэдактара газеты М. Л. Бахціна (псеўд. Міхаіл Хмуры), вершы і апавяданнізамалёўкі мясц. аўтараў, рэцэнзіі на тэатр. і муз. выступленні ў горадзе, асвятляла дзейнасць мясц. муз.-драм. т-ва. *У. М. Конан.*

**«ПОЛЕ́ССКАЯ МЫСЛЬ»,** грамадска-палітычная і літаратурная газета радыкальнага ліберальна-буржуазнага кірунку. Выдавалася на рус. мове ў Гомелі з 16(29).3 да 22.9(5.10).1909 спачатку штодзень, з № 10 тры разы на тыдзень. Кірунак газеты ў значнай меры залежаў ад адносін паміж яе ліберальна-бурж. выдаўцамі і супрацоўнікамі радыкальна-дэмакр. поглядаў (М. І. Кулябка-Карэцкі, В. Л. Склоўскі і інш.). У «Эканамічных нататках» (28.7.1909) пісала, што тагачасная дзяржава была «прыказчыкам капіталістаў». У нарысе пра літоўскі нац. рух (23.5.1909) адзначала «крыштальна ясную праграму марксістаў» у іх спрэчках з бурж. нацыяналістамі. Пераказала даклад Г. В. Пляханава «Рэлігійныя пошукі ў Расіі», прачытаны ім ў Жэневе. Прапагандавала рэаліст. традыцыі рус. л-ры, асабліва творчасць А. Чэхава і Л. Талстога. Неадназначна ацэньвала мадэрнісцкія, дэкадэнцкія і натураліст. плыні ў рус. і зах.-еўрап. л-ры пач. 20 ст.: падкрэслівала наватарства А. Блока, Ф. Салагуба, А. Стрындберга, станоўчыя і адмоўныя бакі прозы М. Арцыбашава і паэзіі сімвалістаў. Крытыкавала пранікненне безыдэйнай «масавай» культуры ў тэатр. мастацтва і кінематограф. Змясціла рэцэнзію на літ. альманах «Туманы» (Мн., 1909), у якой прыхільна ставілася да артыкула У. Самойлы пра творчасць Блока. У «Культурных нататках» (17.5.1909) падтрымала бел. культ.-нац. рух, творчасць Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Я. Купалы. З 24.9(7.10).1909 выходзіла газ. *«Полесье».* *У. М. Конан.*

**«ПОЛЕ́ССКАЯ ПРА́ВДА»,** аб'яднаная газета. Орган Пінскага райкома і гаркома КПБ, раённага і гарадскога Саветаў нар. дэпутатаў. Выдаецца на рус. мове ў Пінску з вер. 1939 чатыры разы на тыдзень. У 1939—54 пінская абл. газета «Палеская праўда», у 1943—44 выдавалася падпольна на тэрыторыі, акупіраванай ням.-фаш. захопнікамі. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам., культ. жыцця. З 1946 пры рэдакцыі працуе літ. аб'яднанне «Арбіта» (сярод яго выхаванцаў бел. паэтэса Я. Янішчыц).

**«ПОЛЕ́СЬЕ»,** грамадска-палітычная і літаратурная газета радыкальна-ліберальнага кірунку. Выдавалася на рус. мове ў Гомелі з 24.9 (7.10).1909 да 7(20).10.1912 тры разы на тыдзень. Абвясціла сябе пераемніцай газ. *«Полесская мысль».* У першых нумарах станоўча ацаніла пазіцыю сацыял-дэмакратаў, крытыкавала кадэтаў. Выступала за інтэлектуальную і палітычную свабоду, спасылалася на творы рус. рэв. дэмакратаў, у т. л. на «Пісьмо да Гогаля» В. Бялінскага. У выніку адм. спагнанняў і судовых ганенняў кіраўнікі газеты адмовіліся ад адкрытых сімпатый да сацыял-дэмакр. руху. Газета высока ацаніла грамадзянскі подзвіг і літ.-філас. спадчыну Бялінскага і М. Чарнышэўскага. Найвялікшым здабыткам рус. народа лічыла творчасць Л. Талстога (прысвяціла яму шэраг артыкулаў, друкавала ўрыўкі з яго твораў, арыгінальна трактавала драму «Жывы труп»), А. Пушкіна, А. Чэхава, Ф. Дастаеўскага. Станоўча ацаніла творчасць А. Андрэева, А. Купрына, асобныя творы М. Горкага, друкавала ўрыўкі з яго публіцыстыкі. Падтрымлівала традыцыі крыт. рэалізму, ідэйнасці і народнасці ў л-ры і тэатр. мастацтве, крытыкавала дэкадэнцкія і натураліст. тэндэнцыі ў маст. культуры (асобныя творы М. Арцыбашава, Н. Вярбіцкай і інш.), эпігонства ліберальных народнікаў. Прызнавала пазітыўнае значэнне наватарскіх пошукаў К. Бальмонта, П. Верлена, Ш. Бадлера. Змясціла крытычны аналіз прац рус. філосафаў-ідэалістаў і містыкаў В. Розанава і М. Бярдзяева. Падтрымлівала У. Меерхольда, погляды К. Станіслаўскага. Асвятляла тэатр. і муз. жыццё Гомеля, дзейнасць муз.-драм. т-ва. Друкавала вершы, апавяданні і нарысы мясц. аўтараў. У арт. «Пра беларускае пытанне» (13.3.1912) прыхільна ставілася да нац. самавызначэння беларусаў. *У. М. Конан.*

**ПОЛІ...** (ад грэч. polys многі, шматлікі, вялізны), першая састаўная частка складаных



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ